8. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Kariera Nikodema Dyzmy, Zrzeszenie Księgarstwa. – Warszawa, 1983. – S. 320.
9. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Bracia Dalcz i s-ka. – Kraków: Wydawnictwo Łódzkie, 1989. – T. 1. – S. 304.
10. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Bracia Dalcz i s-ka. – Kraków: Wydawnictwo Łódzkie, 1989. – T. 2. – S. 261.
11. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Znachor. – Katowice: Książnica, 1991. – S. 507.
12. Tadeusz Dołęga – Mostowicz / Dr. Murek zredukowany. – Warszawa: TOWARZYSTWO WYDAWNICZE «RÓJ», 1936.
13. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Drugie życie Doktora Murka, SOMIX. – Bydgoszcz, 1990. – S. 226.
14. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Kiwony, Krajowa Agencja Wydawnicza. – Białystok 1987. – S. 296.
15. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Prokurator Alicja Horn, Wydawnictwo Rytm. – Warszawa, 2010.
16. Tadeusz Dołęga – Mostowicz – Pamiętniki pani Hanki , Wydawnictwo Pruszyński i S-ka. – Warszawa, 1997
17. Режим доступа: http://wpolityce.pl/polityka/220268-82-lata-temu-tadeusz-dolega-mostowicz-przewidzial-donalda-tuska-w-brukseli.

**(Дата подачи: 18.02.2016 г.)**

*П. Ю. Булаты*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*P. Y. Bulaty*
Republican Institute of Higher Education, Minsk

**УДК 94(474/476)ВКЛ**

# УЗНІКНЕННЕ, СПЕЦЫФІКА І АСАБЛІВАСЦІ ГРАФСТВАЎ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

# THE EMERGENCE, SPECIFICS AND PECULIARITIES OF COUNTYS IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA (16th ct.)

*Артыкул прысвечаны тэме ўзнікнення на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага маёнткаў-графстваў і распаўсюджванню графскіх тытулаў сярод шляхты. Паказаны працэс трансфармацыі паняцця графства ў еўрапейскай прасторы, выяўлены яго асаблівасці ў ВКЛ. Увага нададзена ролі і значэнню наяўнасці тытулаў у асяроддзі пануючых колаў; разглядаецца значэнне тытулаў у працэсе фарміравання супольнасці магнатаў ВКЛ.*
*Ключавыя словы: Вялікае Княства Літоўскае; графства; магнатэрыя; маёнткі.*

*The article is dedicated to the history of establishment of counties in the territory of Grand Duchy of Lithuania and dissemination of count title among noble people. The transformation process of earldom in European area is shown, it's peculiarities in Grand Duchy of Lithuania are identified. Attention paid to the role and significance of titles existence among managerial classes; significance of titles is analyzed in the process of formation of magnates' class in Grand Duchy of Lithuania.*
*Key words: Grand Duchy of Lithuania; county; magnat; manor.*

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі было зроблена шмат глыбокіх, усебаковых і комплексных даследаванняў, прысвечаных розным галінам і аспектам жыцця Вялікага Княства Літоўскага. Адбылося пэўнае пераасэнсаванне гістарычнага працэсу і яго ролі ў сучасным грамадстве. Аднак пэўныя тэмы патрабуюць удасканальвання. Адной з такіх тэм з'яўляецца спецыфіка і асаблівасці маёнткаў-графстваў на тэрыторыі ВКЛ.

Графствамі (познелац. *comitatus*; ням. *Grafschaft*; англ. *county*), згодна з энцыклапедыяй Гісторыі Беларусі, у ВКЛ неафіцыйна называліся пэўныя вялікія магнацкія маёнткі ў перыяд з XVI ст. па XVIII ст. [1, с.117]. Дадзенае паняцце для назвы пэўнай тэрытарыяльнай адзінкі прыйшло з Заходняй Еўропы на землі ВКЛ з пэўнымі асаблівасцямі яго вызначэння.

У Заходняй Еўропе паняцце графства цягам стагоддзяў трансфармавалася і набывала розныя значэнні. Акрэсліць дадзены працэс можна наступным чынам.

Першапачаткова графствы з'яўляліся адзінкамі абласнога падзелу ў Франкскай дзяржаве і ў Англіі. Энцыклапедычны слоўнік Бракгаўза і Ефрона паведамляе, што каралі дынастыі Меравінгаў, усталёўваючы лад сваёй дзяржавы, карысталіся абласнымі дзяленнямі, якія ўжо раней існавалі, напрыклад, у рымскай Галіі (гарадскія акругі, або civitates). Падобныя ж гарадскія акругі ўтвараліся і ў чыста германскіх землях, або ў аснову іх дзяленняў закладваліся тэрыторыі, раней занятыя асобнымі дробнымі плямёнамі. Усе гэтыя акругі паступова прымалі характар аднастайных адміністрацыйна-судовых, фінансавых і ваенных адзінак дзяржавы, на чале якіх стаяў граф, а ў дачыненні да іх пачалі ўжываць назву *comitatus* – графства [2].

З цягам часу і развіццём феадальных адносін графствы на кантыненце страцілі значэнне адміністрацыйных дзяленняў дзяржавы: пад гэтым імем сталі разумець сукупнасць зямель, якімі валодала асоба з тытулам графа. Так у Заходняй Еўропе склаліся сярэднявечныя графствы, якія часта з'яўляліся асобнымі феадальнымі адзінкамі [2].

У позні час, з заняпадам феадалізму і развіццём нацыянальных дзяржаў, графствы страцілі сваё значэнне як асобныя феадальныя адзінкі і трансфармаваліся ў буйныя маёнткі. Менавіта ў гэтым вызначэнні графствы трапілі на землі ВКЛ.

У ВКЛ графствы фактычна былі тэрытарыяльнымі адзінкамі, якія падпарадкоўваліся аднаму магнату з асобным апаратам кіравання. Яны як маёнткі перадаваліся ў спадчыну ў родзе ўладальніка або яго сваякам. Назвы графстваў звязваліся з графскім тытулам, які атрымлівалі ад германскага імператара і якім дазвалялася карыстацца ў ВКЛ [1, с.117].

Разгляд тэмы графстваў у ВКЛ закранае не менш актуальную для даследавання тэму тытулаў шляхты. У айчынай гісторыі разнастайныя тытулы не набылі такога вялікага распаўсюджання, як у іншых еўрапейскіх краінах, дзе феадальная лесвіца мела складаную і разгалінаваную іерархію. Так, на працягу амаль шасці стагоддзяў (з 980 г., калі ў «Аповесці мінулых часоў» згад-

ваецца кіраўнік Полацка варажскі князь Рагвалод, да 1555 г.) на беларускіх землях існаваў адзіны тытул – княжацкі. Але ў 1555 г. прадстаўніку ВКЛ быў нададзены тытул графа Святой Рымскай імперыі. Напачатку XVI ст. акрамя ўласных княжацкіх тытулаў у дзяржаве з'яўляюцца тытулы замежныя, а менавіта – князь Святой Рымскай Імперыі, які, як і графскі тытул, надаваўся імператарам [3, с. 410].

Адным з першых тытул князёў Святой Рымскай імперыі ў 1518 г. атрымаў Мікалай Радзівіл па мянушцы amor Poloniae. Імператар Максіміліян I надаў яму тытул князя «на Гонядзі і Мядзелі». Для ўсіх прадстаўнікоў роду імператарскі княжацкі тытул 10 снежня 1547 г. здабыў Мікалай Радзівіл «Чорны». Ён таксама атрымаў тытул ад імператара Фердынанда «графа на Шыдлоўцах». Апроч Радзівіла, у 1555 г. графскі тытул атрымалі Юры Шчаснавіч Ільініч і Геранім Хадкевіч. У той жа час тытулы атрымалі прадстаўнікі роду Агінскіх (ужывалі як княжацкі, так і графскі тытул).

Працэс развіцця арыстакратычнай тытулатуры і далейшае яе распаўсюджанне на іншыя заможныя роды быў замаруджаны і нават спынены пасля 1569 г. – з моманту прыняцця акта Люблінскай уніі. У наваствораной дзяржаве – Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў – шляхта кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага ўраўноўвалася ў сваіх правах. Адпаведна з гэтым прынцыпам шляхетнай роўнасці наяўнасць тытулу не надавала пэўнага прывілеяванага становішча ў грамадстве і з'яўлялася хутчэй фармальнасцю. За выключэннем невялікай колькасці зацверджаных раней старажытных княжацкіх, усе астатнія тытулы павінны былі быць скасаванымі [3, с. 9].

Аднак распаўсюджанне графскіх тытулаў і, адпаведна, графстваў для Кароны было вялікім выключэннем, чаго нельга сказаць пра ВКЛ, дзе нягледзячы на дэклараваную шляхетную роўнасць тытулатура не толькі захавалася, але і павялічвалася колькасць графскіх родаў і маёнткаў-графстваў. Прычыны гэтаму бачацца ў наступным.

Першае ўражанне для пануючага класа ВКЛ ад вынікаў Люблінскай уніі, падзей, што ёй папярэднічалі, было шокавым, прычым як для магнацтва, так і для шляхты, якая ў свой час дамагалася злучэння з Польшчай. Для вышэйшай уплывовай знаці Люблінская унія пагражала поўнай згубай былога палітычнага вяршэнства. Так, пераставаў існаваць Сойм ВКЛ, а ў Сенат Рэчы Паспалітай большасць былых членаў паноў-рады не трапілі. Не мелі істотнага ўплыву на Сойм і паслы (толькі 46 са 180 месцаў належала паслам з паветаў ВКЛ). Палітычную дыскрымінацыю дадавала дыскрымінацыя эканамічная. Пасля уніі прадстаўнікі шляхецкага саслоўя ВКЛ не маглі атрымліваць зямлю ў тых раёнах, якія пераходзілі пад юрысдыкцыю Кароны. Таксама дазвол польскай шляхце на атрыманне зямельных уладанняў у межах княства стварыў небяспечнага канкурэнта для шляхты мясцовай.

Безумоўна, такое становішча нараджала ў большай часткі пануючага класа ВКЛ сепаратысцкія, антыпольскія настроі. Яны праяўляліся ў рэзкім

непрыняцці шляхтай, як буйной, так і дробнай, уніі. Характэрна, што такім настроем адпавядалі і справы. Незалежніцкая палітыка адбывалася як у палітыка-эканамічнай, так і ў духоўнай галіне жыцця тагачаснага грамадства. Насуперак Люблінскаму акту аб уніі на працягу 70–80-х гг. у ВКЛ рэгулярна збіраліся агульнадзяржаўныя соймы. Больш таго, у 1581 г. ствараецца, а з 1582 г. пачынае дзейнічаць Галоўны трыбунал ВКЛ. Аднак самым моцным усплёскам дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ было прыняцце Статута 1588 г., які, па сутнасці, скасоўваў шматлікія пастановы Люблінскай уніі, а менавіта: ВКЛ паўставала самастойнай дзяржавай не толькі з асобным заканадаўствам, але і са сваёй тэрыторыяй, апаратам, войскам, фінансамі, адмяняўся пункт, па якому палякі маглі набываць зямельную ўласнасць і займаць дзяржаўныя пасады ў межах ВКЛ.

Захаванне прадстаўнікамі пануючага класа сваіх тытулаў, нададзеных германскім імператарам, на наш погляд, з'яўляецца таксама прыкметай вышэй згаданай незалежніцкай палітыкі шляхты ВКЛ. Так, наяўнасць тытула князя альбо графа рабіла шляхціца з Княства адметным ад шляхціца з Кароны. Сваіх тытулаў прытрымліваліся не толькі роды, якія атрымалі іх да Люблінскай уніі, але і некаторыя іншыя, якія атрымалі іх пасля 1569 г. Напрыклад, ваявода падляшскі і смаленскі Васіль Тышкевіч атрымаў для сябе і сваіх нашчадкаў тытул графа ў лістападзе 1569 г. Атрыманне тытулаў літоўскай арыстакратыяй адбывалася і ў больш позні час. У XVII ст. графскія тытулы атрымалі прадстаўнікі роду Дэнгаф, Забелаў, Ракіцкіх.

На прытрымліванне арыстакратыяй сваіх тытулаў уплывалі і пэўныя сацыяльныя працэсы, якія адбываліся ў ВКЛ. Так, у перыяд XV–XVI стст. у ВКЛ, як адзначае даследчыца Альбіна Семянчук, сярод шляхты пачынае вылучацца магнацкая праслойка паноў-рады ВКЛ, у руках якой канцэнтравалася найбольшая ўлада. У той жа час пачынае фарміравацца магнацкі двор. Магнацкі двор у значнай ступені адрозніваўся ад звычайнага шляхецкага, бо ствараўся на ўзор і падабенства двара каралеўскага (альбо велікакняжацкага). Магнацкімі прынята называць найбольш уплывовыя і багатыя шляхецкія роды ВКЛ. Вылучацца яны пачалі якраз у той час, калі адбывалася інтэграцыя Княства і Кароны і змяніліся адносіны вялікага князя літоўскага і караля польскага да ВКЛ: на першае месца ў дзяржаве выходзіць Польскае каралеўства, а Княства застаецца ў ценю. Да таго ж у пачатку XVI ст. выгаслі старыя ўплывовыя роды Давойнаў, Кежгайлаў, Манівідаў, Гаштольдаў, якія адыгрывалі найбольш значную ролю ва ўнутранай палітыцы ВКЛ. Іх месца занялі тытулаваныя Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы [4, с.140].

Даследчыца таксама вылучае пэўныя рысы, якія робяць шляхціца магнатам. Акрамя вялікіх латыфундый і маёнткаў, дзяржаўных пасад і блізкасці да каралеўскага двара, адзначаюцца сямейныя сувязі і значэнне роду, а таксама асабістыя якасці – адукацыя. Менавіта асоба магната ўплывала на фарміраванне магнацкага двара [4, с. 141]. Апрача таго, на

наш погляд, важным пунктам у наборы магнацкіх адметнасцей, але першапачаткова не самым вырашаючым, была наяўнасць ці то княжацкага, ці то графскага тытула. Яго наяўнасць рабіла магната адметным ад іншых прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя, і хай і фармальна, у пэўнай ступені ўзвышала ў феадальнай лесвіцы, а таксама надавала вонкавы лоск магнацкаму тытулаванаму двару. У XVIII ст., нягледзячы на тое, што шляхецкая саслоўная роўнасць працягвалася дэклараваецца, фактычна пануючую ролю ў грамадстве займалі тытулаваныя прадстаўнікі магнатэрыі ВКЛ [3, с. 9].

Адпаведна маёнткі, якімі валодалі магнаты з графскім тытулам, называліся графствам. Ад звычайных маёнткаў маёнткі-графствы адрозніваліся тэрыторыяй і тым, што ўключалі ў сябе драбнейшыя маёнткі. У XVI ст. у ВКЛ існавалі наступныя графствы: на Міры (уладальнікі Ільінічы), на Шклове, Быхаве, Мышы, Глуску, Ляхавічах (маёмасць Хадкевічаў), на Лагойску і Бярдзічаве (уладанне Тышкевічаў), на Шыдлоўцы, Койданаве, Копысі, Заблудове, Кейданах, Крожах і Белай (уладальнікі Радзівілы, якія апроч графскага тытула, мелі і тытул княжацкі) [1, с. 117]. У XVIII ст. колькасць графстваў у ВКЛ узрасла і складала больш за тры дзясяткі.

Падрабязней разгледзім атрыманне графскага тытула і фарміраванне маёнткаў-графстваў на прыкладзе роду Хадкевічаў.

Род Хадкевічаў – старажытны і ўплывовы род ВКЛ, які вызначаўся многімі прыкметамі магнацкага роду – знатнасцю паходжання, багаццямі, палітычнай уплывовасцю, шматграннай дабрачыннасцю [4, с. 148]. Адносна паходжання роду гістарыяграфія прадстаўляе некалькі версій, сярод якіх найчасцей прыводзяцца літоўскія або жамойцкія карані гэтых магнатаў. Як адзначае сучасная літоўская даследчыца Генутэ Кіркене, навуковая гістарыяграфія, якая фарміравалася ў XIX ст., указвала на паходжанне Хадкевічаў ад кіеўскіх баяр, што падтрымлівалася і ў польскай гістарыяграфіі. Ключом для правільнай разгадкі пытання паходжання роду з’яўляецца вызначэнне пазіцыі роданачальніка Ходкі Юраговіча, аб якім згадваюць дакументы 1431–1447 гг. Крыніцы паведамляюць, што пры панаванні Жыгімонта Кейстутавіча палітычная пазіцыя Ходкі паступова ўзмацнялася. Ён быў шостай пасля князя асобай у дзяржаве. Справу ўскладняе прысутнасць Ходкі ў лагеры галоўнага саперніка Жыгімонта – князя Свідрыгайлы. Немагчыма адназначна вызначыць, ці была гэта адна асоба, якая памяняла суверэна, ці дзве розныя. Навейшыя навуковыя даследаванні даказваюць, што роданачальнікамі Хадкевічаў былі гродзенскія баяры – праваслаўныя баяры літоўскага паходжання [5].

У XVI ст. род Хадкевічаў увайшоў у шэрагі пануючага кола магнатаў ВКЛ, прадстаўнікі якога займалі ключавыя пасады ў тагачаснай дзяржаве. Адзін з прадстаўнікоў роду, заснавальнік яго Быхаўскай лініі, Геранім Хадкевіч займаў пасаду падчашага літоўскага (1542–1544), кашталяна троцкага (1544–1549), старосты жамойцкага (з 1545), кашталяна

віленскага (1559–1561), старосты ашмянскага (1538–1541), радуньскага (1542–1545), цельшаўскага (1546–1554), вількійскага (1536 ці 1550–1561), шклоўскага (1550–1554). У Monografie historyczno-genealogicznej niektórych rodzin polskich (1859 г.) Станіслаў Касакоўскі адзначае, што «Жыгімонт Аўгуст засылаў мужа таго (Геранiма Хадкевіча. – *аўт*.), вядомага сваёй разважлівасцю, пасольствам да Папы Паўла IV і да Цэзара Фердынанда, катораму спадабалася яго красамоўе, за што надаў яму і яго сям'і тытул Графа Святой Рымскай Імперыі» [6, с. 73]. Жыгімонт Аўгуст той тытул зацвердзіў, і з таго часу ўсе тры сыны Аляксандра Хадкевіча – сам Геранім, Рыгор, Юры – і іх нашчадкі прымалі графскі тытул.

Ад 10 чэрвеня 1568 г. згодна з прывілеем Жыгімонта Аўгуста ўладанні Хадкевічаў на Шклове, Мышы, Быхаве і Глуску набываюць статус графстваў (калі ў 1572 г. Ян Геранім Хадкевіч набыў Ляхавіцкую дзяржаву, яна таксама набыла дадзены статус) [7, с. 55]. Адбыліся і пэўныя геральдычныя змены. Новы родавы герб, зацверджаны ў тым жа 1568 г., меў наступны выгляд: на тарчы ў першым верхнім полі герб «Касцеша», у другім ніжнім – «Пагоня», у сярэднім – герб Інфлінтаў – белы грыф трымае меч (Ян Геранім быў намеснікам Інфлянтаў), у чацвёртым верхнім полі – Лебедзь, у пятым – Корчак. Усе гербы – у чырвоным полі, толькі Лебедзь у блакітным. Над тарчай змешчаны тры гелмы, сярэдні ўвенчаны графскай каронай і кляйнотам у выглядзе паў-Грыфа. Над першым гелмам змешчана пяць страўсавых пер'еў, над трэцім – кляйнот у выглядзе паловы Лебедзя [3, с. 252].

У будучыні прадстаўнікі роду Хадкевічаў насілі графскі тытул, а іх маёнткі набывалі статус графстваў.

Такім чынам, разгледзеўшы пытанне, звязанае з узнікненнем на тэрыторыі ВКЛ графскіх тытулаў і фарміраваннем маёнткаў-графстваў, можна зрабіць наступныя вынікі:

1. Тэрмін «графства» прыйшоў на землі ВКЛ з Заходняй Еўропы, папярэдне здзейсніўшы пэўную трансфармацыю ва ўласным разуменні. Так, на момант XVI ст. на еўрапейскім кантыненце графствы пераважна ўспрымаліся не як асобныя феадальныя адзінкі, а як буйныя маёнткі. У дадзеным выглядзе гэтае паняцце замацавалася і ў ВКЛ.

2. Адпаведна з прынцыпам шляхетнай роўнасці наяўнасць пэўнага тытула не надавала пэўнага прывілеяванага становішча ў грамадстве і з'яўлялася хутчэй фармальнасцю.

3. Захаванне шляхтай сваіх тытулаў пасля Люблінскай уніі з'яўлялася прыкметай незалежніцкай палітыкі шляхты ВКЛ. Так, наяўнасць тытула князя альбо графа рабіла шляхціца з Княства адметным ад шляхціца з Кароны. Сваіх тытулаў прытрымліваліся не толькі роды, якія атрымалі іх да Люблінскай уніі, але і некаторыя іншыя, якія атрымалі іх пасля 1569 г.

4. Важнае месца ў працэсе фарміравання магнатэрыі ВКЛ набыло існаванне тытулаў. Іх наяўнасць рабіла магната адметным ад іншых прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя і, хай і фармальна, у пэўнай ступені

ўзвышала ў феадальнай лесвіцы, а таксама надавала вонкавы лоск магнацкаму тытулаванаму двару.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Грыцкевіч, А.* Графства / А. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1996. – Т. 3. – С. 117.

2. Графство // Энциклопедический словарь Ф. А. Брокгауза и И. А. Ефрона [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vehi.net/brokgauz/. – Дата доступа: 13.01.2016.

3. *Рассадин, С. Е.* Князья, графы и бароны в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.): история титулов в биографическо-личностном аспекте / С. Е. Рассадин; науч. ред. Г. Я. Голенченко. – Минск: Изд-во БЭМП, 2010. – 430 с.

4. *Семянчук, А.* Магнацкія двары як цэнтры гістарыяграфіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI ст. / А. Семянчук // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зб. навук. пр. / рэдкал.: А. М. Янушкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 139–157.

5. *Kirkiene, G.* Korzenie rodu Chodkiewiczów / G. Kirkiene // Białoruskie Zeszyty Historyczny. – Białystok: Offset-Print, 2002. – № 17. – С. 34–56.

6. *Kossakowski, S.* Monografie historyczno-genealogiczne niektórych rodzin polskich / S. Kossakowski. – Warszawa: Drukarni Gaziety Codziennej, 1859. – 322 с.

7. *Żychliński, T.* Złota księga szlachty polskiej. R. 2 / T. Żychliński. – Poznań, 1880.

**(Дата подачи: 19.02.2016 г.)**

*А. И. Буняк*
Республиканский институт высшей школы, Минск
*A. I. Bunyak*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 93/94**

## МЕСТО БОБРУЙСКОЙ КРЕПОСТИ В СИСТЕМЕ ОБОРОНИТЕЛЬНЫХ СООРУЖЕНИЙ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ В НАЧАЛЕ XIX в.

## THE ROLE OF THE BOBRUISK FORTRESS IN DEFENSIVE STRUCTURES IN THE RUSSIAN EMPIRE IN THE EARLY 19th CENTURY

*В статье рассматривается место Бобруйской крепости в системе оборонительных сооружений Российской империи в начале XIX в. Отмечается необходимость оценки значения крепости в событиях франко-русской войны 1812 г. не только как объекта военно-инженерной мысли и его эффективности в военных событиях 1812 г., но и в качестве элемента системы оборонительных сооружений в масштабе всей Российской империи.*

*Ключевые слова: Бобруйская крепость; фортификация; война 1812 г.; стратегическое планирование; оборонительные сооружения в начале XIX в.*

*The subject of this article is the role of the Bobruisk fortress in the system of fortifications of the Russian Empire in the early 19-th century. It noted the need to assess the value of the fortress during the Franco-Russian War of 1812 not only as the object of military engineering and its effectiveness in campaign of 1812, but also as an element of the system of fortifications across the Russian Empire.*